# Шляхі да кнігі прафесара Кшыштафа Міганя

У XV Міжнародных кнігазнаўчых чытаннях сярод сусветнавядомых аўтарытэтных экспертаў узяў удзел прафесар Уроцлаўскага ўніверсітэта, доктар габілітаваны Кшыштаф Міганъ. Імя вядомага польскага навукоўца ўпісана ў гісторыю кнігазнаўства XX стагоддзя, дзякуючы яго кнігам "Навука пра кнігу сярод іншых грамадскіх навук","З гісторыі навукі пра кнігу", "Навука пра кнігу. Нарыс праблематыкі".

выдадзены ў Польшчы, Расіі і Германіі. Гэтыя тэмы былі найбольш важнымі для мяне ў праграме XV Міжнародных чытанняў, а таксама шляхі гісторыі кніг.

Я распавядаў пра некаторыя новыя даследванні ў гісторыі кніжнай культуры, пра тое, што можна паказаць метадам гістарычнай геаграфіі і картаграфіі.

На секцыі я прапанаваў даклад " Шляхі і падарожжы кніг" і паказаў шляхі гістарычнай кар-



Многія беларускія бібліёграфы былі рады сустрэчы з класікам і мэтрам сучаснага кнігазнаўства. Дзякуючы прафесару Кшыштафу Міганю, кнігазнаўчыя даследванні развіваліся ў сучаснай Польшчы. Ён стаў заснавальнікам польскай кнігазнаўчай школы, быў рэктарам аднаго з раздзелаў Польскай энцыклапеды па кнігазнаўству, выконваў абавязкі загадчыка Аддзела тэорыі і гісторыі кнігі Інстытута навуковай інфармацыі і бібліятэказнаўства Уроцлаўскага ўніверсітэта.

Навуковец не аднойчы выступаў з дакладамі на паседжаннях Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый у Празе, Братыславе, Будапешце, Берліне. Прафесар Кшыштаф Мігань - сябар Міжнароднага бібліялагічнага таварыства ("Association Internationale de Diblioligie"), а таксама - вядомы польскі арыенталіст. Ён вывучае гісторыю кнігі і чытання, польскую нацыянальную культуру, гісторыю навукі, добра ведае замежныя мовы.

- Мяне цікавяць фундаментальныя пытанні рамак і асноваў кнігазнаўчых кампетэнцый, тэорый кнігазнаўства, сродкаў перадачы дадзеных, - падзяліўся думкамі прафесар Мігань. - Мая вузкая спецыяльнасць -тэорыя і метадалогія кнігазнаўства, навука пра кнігу як універсітэцкая дысцыпліна. Я напісаў некалькі манаграфій на гэтую тэму, якія былі

таграфіі. Мы ведаем звесткі, якія дайшлі да нас з ранейшых часоў. Ведаем, што Гутэнберг друкаваў свае кнігі ў Германіі, але якім чынам яны патрапілі ў Польшчу, мы не ведам.

Шляхі некаторых асобнікаў і цэлых збораў назвычай цікавыя! Я прадэманстраваў рабочую майстэрню даследчыка і параіў, што можна зрабіць.

На пытанне пра крыніцы яго любові да кнігі прафесар Мігань адказаў:

- Я нарадзіўся ў 1940 годзе ў мястэчку Багуславіцы паблізу ад Чэнстахова. Мае бацькі Ганна і Станіслаў Мігані былі настаўнікамі, яны выхоўвалі ў мяне любоў да кнігі з дзяцінства, я вырас у асяроддзі кніг, адчуваў цікавасць да гісторыі, літаратуры і ўсходніх моваў, марыў даследваць краіны Усходу.

У 1957 годзе пасля заканчэння ліцэя я паступіў на факультэт бібліятэказнаўства Уроцлаўскага ўніверсітэта, бо верыў, што праз глыбокую цікавасць да кнігі прыйду да арыенталістыкі.Таму цікавіўся вывучэннем замежных моваў, у тым ліку - эсперанта. Мары юнацтва змяніліся пад уплывам часу і абставін, але спраўдзіліся. Таму жадаю поспехаў усім беларускім даследчыкам на абраным ім шляху даследвання гісторыі кнігі!

***Гутарыла Эла Оліна,***
*фота аўтара.*